12. Опись дел архива Государственного совета. – Т. 11. 1889–1894. – Петроград: Государственная типография, 1914. – 469 с.

13. Отчет по делопроизводству Государственного совета за время с 1 января 1892 г. по 31 мая 1893 г. – СПб. : Государственная типография, 1893 г. – Т. 1. – 932 с.

14. Полное собрание законов Российской империи (ПСЗРИ). СПб. : Государственная типография, 1893. – Собрание 3. – Т. X. – СПб, 1890. – 1090 с.

15. ПСЗРИ. – Собр. II. – Ч. II. – Т. XVII // Высочайше утвержденное Положение об имениях, жалуемых на праве майоратов в губерниях, от Польши возвращенных. № 16297. С. 180. СПб., 1843.

16. ПСЗРИ. – Собр. II. – Ч. I. – Т. XX. – СПб., 1846 // Высочайше утвержденное положение о заповедных наследственных имениях. – № 19202. – С. 528.

17. Свод законов гражданских // Свод Законов Российской Империи. Полный текст всех 16 томов, согласованный с последними продолжениями, постановлениями, изданными в порядке ст. 87 Законов Основных, и позднейшими узаконениями. Т. X / под ред. И. Д. Мордухай-Болтовского. СПб., 1912. Ст. 384, 420. URL: http://civil.consultant.ru/reprint/books/211/388.html.

18. *Сергеевич, В.* Лекции и исследования по древней истории русского права / В. Сергеевич. – засл. ор. проф. С.-Петерб. ун-та. 4-е изд. доп. и поправлено. – СПб. : тип. И. Н. Скороходова, 1910. – 667 с.

19. *Смородский, А. П.* Столетие Минской губернии, 1793–1893 : ист.-стат. зап. / сост. секретарь Мин. губерн. стат. ком. А. П. Смородский. 2-е изд., испр. и доп. Минск : Типолитогр. Р. Дворжец, 1893. – 90 с.

20. *Тимофеева, А. А.* История предпринимательства в России: монография / А. А. Тимофеева. – Владивосток: Издательство ВГУЭС, 2005. – 218 с.

21. Archiwum Główne Akt Dawnych w Warszawie (AGAD). – AR. – Dz. XI. – Koperta 84. – Sign. 853. Zarejestruj gospodarstw księcia Dominika Radziwiłła. XIX w.

22. AGAD. – Archiwum Radziwiłłów z Nieborowa. – Sign. 35. Michał Hieronim Radziwiłł. Opieks nad Dominikiem Radziwiłem. 1814–1824 r.

23. AGAD. – Zbiór kartograficzny. – 431–21. Reestr Nieświeżskoje ordynacie. 1859 r.

24. *Baliński, M.* Starożytna Polska pod względem historycznym, geograficznym i statystycznym : w 4 t. / M. Baliński, T. Lipiński. – Warszawa : Nakl. i druk S. Olgelbranda, 1843–1846. – T. 4. – 1846. – 634 s.

25. *Zielińska, T.* Poczet polskich rodów arystokratycznych / T. Zielińska. – Warszawa : Wydaw. Szkolne i Ped., 1997. – 592 s.

УДК 94(476):336.23"17/18"

# РЭСПОНСІЯ ЯК АСОБНЫ ЗБОР З КАМАНДОРНЫХ МАЁНТКАЎ МАЛЬТЫЙСКАГА ОРДЭНА НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСКІХ ГУБЕРНЯЎ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ

**А. У. Ерашэвіч**

*Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт, пр. Партызанскі, 26, 220070, г. Мінск, erash06@rambler.ru*

У артыкуле на аснове заканадаўчых актаў, архіўных справаводных дакументаў, звестак афіцыйнай фінансавай статыстыкі прыведзены колькасныя дадзеныя аб спагнанні так званай «респонсии» – асобных 10 % збораў з заснавальнікаў

камандорстваў ордэна Св. Іаана Іерусалімскага (Мальтыйскага ордэна) на тэрыторыі беларускіх губерняў Расійскай імперыі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст.

***Ключавыя словы:*** дзяржаўныя падаткі; зборы; Мальтыйскі ордэн; беларускія губерні; Расійская імперыя.

# РЕСПОНСИЯ КАК ОТДЕЛЬНЫЙ СБОР С КОМАНДОРСТВЕННЫХ ИМЕНИЙ МАЛЬТИЙСКОГО ОРДЕНА НА ТЕРРИТОРИИ БЕЛОРУССКИХ ГУБЕРНИЙ РОССИЙСКОЙ ИМПЕРИИ

**А. В. Ерошевич**

*Белорусский государственный экономический университет, пр. Партизанский, 26, 220070, г. Минск, erash06@rambler.ru*

В статье на основе законодательных актов, архивных делопроизводственных документов, сведений официальной финансовой статистики приведены количественные данные о взимании так называемой «респонсии» – отдельных 10 % сборов с учредителей командорств ордена св. Иоанна Иерусалимского (Мальтийского ордена) на территории белорусских губерний Российской империи в конце XVIII – первой половине XIX в.

***Ключевые слова:*** государственные подати; сборы; Мальтийский орден; белорусские губернии; Российская империя.

# A RESPONSE AS A SEPARATE COLLECTION FROM THE COMMANDERY ESTATES OF THE ORDER OF MALTA ON THE TERRITORY OF THE BELARUSIAN PROVINCES OF THE RUSSIAN EMPIRE

**A. V. Yerashevich**

*Belarusian State Economic University, Partyzanskaja Avenue, 26, 220070, Minsk, Republic of Belarus, erash06@rambler.ru*

The article, based on legislative acts, archival records, and official financial statistics, provides quantitative data on the collection of the so–called “response” – separate 10 % fees from the founders of the commanderies of the Order of St. John of Jerusalem (Order of Malta) on the territory of the Belarusian provinces of the Russian Empire at the end of the XVIII – first half of the XIX century.

***Keywords:*** state taxes; fees; Order of Malta; Belarusian provinces; Russian Empire.

У Расійскай імперыі ордэн св. Іаана Іерусалімскага складаўся з расійскага каталіцкага Вялікага прыёрства, заснаванага 1.01.1797 г. і Вялікага прыёрства расійскага, створанага 29.11.1798 г. [12]. У расійска-каталіцкае Вялікае прыёрства прымалі ў асноўным пецярбургскіх французскіх эмігрантаў з ліку рыцараў-каталікоў, сярод яго членаў было шмат пра-

васлаўных дваранскіх арыстакратаў (вялікі князь Аляксандр, Галоўкін, Юсупаў, Трубецкой, Далгарукі, Ігнацьеў, Дзямідаў, Нарышкін). У склад Вялікага расійска-каталіцкага прыёрства ўваходзілі прадстаўнікі знатных родаў былой Рэчы Паспалітай і каталіцкія падданыя расійскай дзяржавы. Сярод камандораў былі графы Вяльгорскі, Грабоўскі, Ірэней Храбтовіч, князі Канстанцін Любамірскі, Міхаіл і Андрэй Радзівілы, Адам і Канстанцін Чартарыйскія. Родавыя камандорствы заснавалі графы Іосіф Борх, Іосіф Корвін-Касакоўскі, Міхал Лопат, Іосіф і Казімір Плятэры, Октавіц Шуазель-Гуф'е, князі Людвіг Радзівіл і Франц Сапега. У другое Вялікае прыёрства расійскае залічаліся дваране праваслаўнага веравызнання. У канцы 1799 г. расійскае каталіцкае Вялікае прыёрства ордэна св. Іаана Іерусалімскага складалася з 7 рыцараў вялікага крыжа, 20 камандораў, 9 уладальнікаў сямейных камандорстваў, 3 капеланаў і 79 рыцараў «па праву», у асноўным з ліку французскіх эмігрантаў. Расійскае праваслаўнае Вялікае прыёрства Мальтыйскага ордэна ўключала 12 рыцараў вялікага крыжа, 92 камандора, 21 уладальніка сямейных камандорстваў і 41 рыцара «па міласці» [18, с. 233–234, 237].

Паводле канвенцыі, заключанай з Мальтыйскім ордэнам 4(15).01.1797 г., Павел I дараваў яму ўзамен даходаў з Астрожскай ардынацыі былой Рэчы Паспалітай суму ў 300 тыс. польскіх злотых штогод (выплачвалася ў 2 тэрміны 30.06.(11.07.) і 31.12.(11.01.) роўнымі часткамі), якія згодна з 3 артыкулам пагаднення дзяржаўнае казначэйства Расійскай імперыі атрымлівала штогод з польскіх эмфітэўтычных староставаў (знаходзіліся ў 50-гадавым валоданні) у абласцях расійскага панавання. Грошы выдаткоўваліся для Вялікага расійскага прыёрства ордэна ў складзе сана вялікага прыёрства і 10 камандорстваў. Вялікае прыёрства павінна было атрымліваць 60 тыс., 1 і 2 камандорствы – па 30 тыс., 3 і 4 – па 20 тыс., 5–10 – па 15 тыс. злотых. Камандоры маглі карыстацца даходамі з 1.05.1798 г. [2, с. 262–263]. Пасля абвяшчэння Паўла I вялікім магістрам Мальтыйскага ордэна ў Пецярбургу пачалося фарміраванне новага капіталу ордэна. Згодна з маніфестам ад 29.11.1798 г. дадаткова для Вялікага расійскага прыёрства выдаткоўвалася па 216 тыс. руб. штогод [13, с. 456]. Паручнік вялікага магістра Вялікага прыёрства расійскага віцэ-адмірал граф Ю. Літэ (Литте) з 1.12.1798 г. атрымліваў штогод у 2 тэрміны (да 30.06. і 31.12.) на заснаванне і ўтрыманне 98 новых дваранскіх камандорстваў і іншыя неабходныя выдаткі па ордэну гэтую суму з дзяржаўнага казначэйства [9; 14].

Здаўна кавалеры крыжа св. Іаана Іерусалімскага за карыстанне зямлёй павінны былі здаваць у касу ордэна асобныя штогадовыя зборы – т. зв. рэспонсіі. За кошт рэспонсій, якія збіраліся ў казну ордэна, былі заснаваны

10 новых камандорстваў з кавалераў Вялікага прыёрства расійскага, кожнае з выплатай па 1 000 руб. штогод [11]. Згодна з маніфестам ад 29.11.1798 г. з уласнікаў камандорных маёнткаў ордэна св. Іаана Іерусалімскага да смерці іх уладальнікаў павінна была збірацца рэспонсія, альбо 20 % з колькасці штогадовых даходаў. Усе ўладальнікі падараваных камандорстваў павінны былі здаваць рэспонсію ў дзяржаўнае казначэйства. Штогадовыя даходы 98 камандорных маёнткаў размяркоўваліся наступным чынам: 2 камандорствы мелі па 6 000 руб., 4 – па 4 000 руб., 6 – па 3 000 руб., 10 – па 2 000 руб., 16 – па 1 500, 60 – па 1 000 руб. асігнацыямі кожнае [13, с. 456; 17, с. 166]. Усе 98 камандорстваў павінны былі штогод уносіць у ордэнскае казначэйства 20 % рэспонсіі і 5 % пажыццёвага збору на рэштак кожнага пасэсара камандорства. Камандоры з 1.07.1799 г. атрымлівалі даходы, пералічаныя з дзяржаўнага казначэйства. Кожны кавалер ордэна св. Іаана Іерусалімскага мог мець толькі адно камандорства [13, с. 456, 458]. Такім чынам, заснавальнікі родавых (фамільных) камандорстваў з мэтай выплаты ў казну ордэна рэспонсіі ў памеры 20 % з даходу камандорнага маёнтка вылучалі для забеспячэння гэтых плацяжоў часткі ўласнага маёнтка. Усяго з 54 маёнткаў вылічылі да збору 106 тыс. руб.

12.04.1799 г. былі абнародаваны правілы для прыёму дваранства Расійскай імперыі ў ордэн св. Іаана Іерусалімскага. Уступленне ў ордэн малалетніх забяспечвалася сумай у 2 400 руб., дарослых – у 1 200 руб. [5, арк. 81–81 адв., 86–86 адв.]. Імянным указам ад 21.07.1799 г. (сенацкім ўказам ад 22.08.1799 г.) Павел I зацвердзіў «Правілы для заснавання родавых камандорстваў ці Jus patronatus у Расіі». Спадчынныя дваранскія камандорствы ствараліся з дазволу імператара як вялікага магістра ордэна. Прэтэндэнт на спадчыннае камандорства павінен быў 5 гадоў быць членам ордэна і не менш як за 2 гады ваеннай службы дасягнуць афіцэрскага чыну. Пасля дасягнення 22-гадавога ўзросту кандыдат пасля ўзносу 1 200 руб. за доказы яго высакароднага паходжання атрымліваў правы камандора і даходы з спадчыннага камандорства. Заснавальнік спадчыннага камандорства павінен быў мець не менш 3 000 руб. гадавога прыбытку і выплачваць 10 % рэспонсіі ці пошліны з гадавога даходу камандорства да дасягнення сынам ці іншым пераемнікам уладання 22 гадоў [1].

На тэрыторыі беларускіх губерняў, у дадатак да існуючых, былі закладзены новыя камандорыі Вялікага прыёрства Мальтыйскага ордэна ў Расійскай імперыі. Вядома, што паводле выпіскі з актавай земскай кнігі Слуцкага павета ад 28.09.1811 г. Д. Радзівіл 2.09.1809 г. прызначыў князя Л. Л. Радзівіла камандорам і перадаў яму Сталавіцкую камандорыю з маёнткамі Пацейкі і Стваловічы [4, арк. 2–17 адв.]. Граф Іосіф Борх для сябе і сваіх спадчыннікаў мужчынскага полу вызначыў для родавага камандорства даходы з Краснапольскага маёнтка ў Люцынскім павеце: сябра пры

уступленні ў ордэн павінен быў заплаціць з штогадовага чыстага даходу ў 12 тыс. злотых у грамадскае казначэйства на Мальце 6 тыс. злотых. У выпадку адсутнасці спадчыннікаў па мужчынскай лініі камандорам станавіўся Станіслаў Багамолец, сын генерал-маёра Пятра Багамольца. На штогадовыя рэспонсіі з чыстага штогадовага даходу належыла перасылаць у грамадскае казначэйства Мальтыйскага ордэна 10 % ці 1 200 злотых. 27.02.1799 г. граф Аляксандр Самойлаў для свайго сына Рыгора і спадчыннікаў-мужчын заснаваў родавае камандорства ці jus patronatus, якое мела 3 тыс. руб. штогадовага даходу і закладзеных у дзяржаўных крэдытных установах 457 душ сялян з вёсак Хомічы, Семеренкі, Бутрымка, Чарны, Радзевічы, Стрэльцы, Одзверня з Барысаўскага ключа Гродзенскай акругі Літоўскай губерні. Штогодны 10 % падаходны падатак у казну ордэна складаў 300 руб., пры неабходнасці плацяжу пошліны за прыём у 1 500 руб. [5, арк. 97–98, 100–100 адв., 125, 130–130 адв.]. 7.04.1799 г. сапраўдны стацкі саветнік маркіз Павел Маруцы (Маруцци) заклаў для свайго сына Канстанціна і наступных спадчыннікаў мужчынскага полу таксама родавае камандорства з штогадовым даходам у 3 000 руб. і закладенымі ў казённых крэдытных установах 356 сялянамі з вёсак Далганск, Дуброўка, Рыгаліна, Удкадска ў Чэрыкаўскім павеце з плацяжом у казну ордэна 10 % гадавога даходу ці 300 руб. За залічэнне ў ордэн Канстацін Маруцы павінен быў здаць у казну ордэна пошліну ў памеры 1 500 руб. [6, арк. 8–8 адв., 9].

Пасля смерці Паўла I новы імператар Аляксандр I узяў на сябе званне пратэктара ордэна св. Іаана Іерусалімскага і даручыў яго кіраванне паручніку вялікага магістра генерал-фельдмаршалу графу Мікалаю Салтыкову [7]. Згодна з рашэннем Дзяржаўнага Савета ад 17.11.1802 г. ліквідаваўся свяшчэнны савет ордэна св. Іаана Іерусалімскага, аднак у абласцях, далучаных да Расіі ад Польшчы, па-ранейшаму захоўвалася расійскае Вялікае каталіцкае прыёрства, паколькі яно існавала раней.

Фактычна дзейнасць Мальтыйскага ордэна ў Расійскай імперыі спынілася ў 1810 г. З 26.02.1810 г. грашовыя сродкі на ордэн св. Іаана Іерусалімскага выдаткоўваліся з дзяржаўнага казначэйства, у распараджэнні якога пакідаліся сумы рэспонсіі [8]. Іншымі словамі, фінансавыя сродкі Мальтыйскага ордэна перадаваліся дзяржаўнай казне. Згодна з сенацкім указам ад 20.11.1811 г. камандоры фамільных камандорстваў ордэна св. Іаана Іерусалімскага мелі магчымасць унесці ў дзяржаўную казну аднаразова капітал адпаведны даходу з камандорных спадчынных маёнткаў для іх поўнага распараджэння, ці былі абавязаны пажыццёва працягваць узнос у дзяржаўную казну частку даходаў для задавальнення ордэнскіх выдаткаў [10, с. 908]. Інакш кажучы, усім камандорам, якія ўсталявалі фамільныя камандорствы, давалася свабода ўнясення ў дзяржаўную казну сумы аднара-

зовага капіталу ў памеры пэўнага адпаведнага даходу, які паступаў на карысць ордэна з камандорскіх маёнткаў (тады яны вызваляліся ад абавязку плацяжу рэспонсіі). Камандоры, якія не жадалі выплаціць аднаразовы капітал, былі абавязаны да смерці пералічаць даходы з маёнткаў у дзяржаўнае казначэйства. Такім чынам, рэспонсіі з камандорстваў Мальтыйскага ордэна ператварыліся ў дзяржаўны падатак. Указам ад 20.11.1817 г. расійскія Вялікія прыёрствы былі скасаваны [18, с. 292].

Аднак і пасля прыпыненння дзейнасці Мальтыйскага ордэна ў Расійскай імперыі (1810–1817 гг.) практыка выплат рэспонсій працягвалася, як і спагнанне запазычанасцей па гэтым зборы. Так, у 1820 г. маёнткі камандора ордэна Св. Іаана Іерусалімскага Л. Ашторпа ў Ігуменскім павеце (вёскі Дакорка (158 душ), Жураўска (195 душ), Харэвіч (131 душа), разам 484 рэвізскія душы мужчын) вызваляліся ад казённага нагляду, паколькі ён унёс, у адпаведнасці з палажэннем Дзяржаўнага Савета ад 10.04.1811 г., у Санкт-Пецярбургскае для рэштковых сум казначэйства 6 000 руб. капіталу і належных 300 руб. рэспонсіі [3, арк. 181–182].

У Расійскай імперыі рэспонсія з камандорных маёнткаў ордэна св. Іаана Іерусалімскага ў якасці збору асобнага роду была прылічана да дзяржаўных акладных падаткаў ведамства Дэпартамента розных падаткаў і збораў Міністэрства фінансаў. Заснавальнікі камандорстваў ордэна св. Іаана Іерусалімскага ў беларуска-літоўскіх губернях у 1810-я–1830-я гг. (за розны перыяд) павінны былі выплаціць пэўныя сумы грошай з камандорных маёнткаў у дзяржаўныя павятовыя казначэйствы: па 300 руб. асігнацыямі штогод граф Іосіф Борх у Віцебскай губерні, маркіз Павел Маруцы (Маруцци) і князь Канстанцін Любамірскі ў Магілёўскай губерні, граф Октавіц Шуазель-Гуф'е ў Віленскай губерні, Леан Ашторп і Іван Марцынкевіч Жаба ў Мінскай губерні, па 375 руб. асігнацыямі граф Іосіф Плятэр у Гродзенскай губерні, па 400 руб. асігнацыямі князь Франц Сапега ў Віленскай губерні. З 1840 да 1850 гг., калі ўсе плацяжы былі пераведзены на сярэбраную манету, з Віленскай губерні штогод належыла сабраць 114,28 руб., у Магілёўскай і Мінскай – па 85,71 руб. рэспонсіі.

Як і па іншых відах дзяржаўных падаткаў, у пэўных губернях назапашваліся нядоімкі па зборы рэспонсіі. За 1828–1847 гг. акрамя Мінскай губерні, недаборы рэспонсіі ў якой увогуле не былі адзначаны і Гродзенскай (да 1831 г. паказана 6 375 руб. асігнацыямі недаплаты), у губернях Віцебскай (за выняткам 1832, 1834–1835, 1840–1841, 1845–1847 гг.), Магілёўскай (не ўлічваючы 1829–1831 гг.) і Віленскай (за выключэннем 1837 г.) былі выяўлены штогадовыя неплацяжы рэспонсіі. Усяго з 1828 да 1839 гг. сума нядоімкі рэспонсіі ў 4 беларускіх губернях фармальна паменшылася з 7 500 да 2 900 руб. асігнацыямі (у 2,6 раза), а з 1840 да 1847 гг. – з 599,99 руб. да 387 руб. серабром (у 1,5 разы). За гэты час было недабрана ў дзяржаўны

скарб, па няпоўных даных, не менш 33 675 руб. асігнацыямі і 4 224,7 руб. серабром рэспонсіі [падлічана: 15, л. 30–135; 16, л. 21–203].

Такім чынам, у беларускіх губернях з 1799 г. да сярэдзіны XIX ст. з заснавальнікаў камандорных маёнткаў ордэна Св. Іаана Іерусалімскага спаганяўся збор рэспонсіі ў памеры 10 % з сумы чыстага даходу, які абвяшчаўся землеўладальнікамі ў мінімальным памеры з мэтай адкрыцця доступу землеўласнікаў да прэстыжнага і ганаровага ў дваранскім грамадскім асяроддзі звання кавалера Мальтыйскага ордэна. Нязначны фіскальны эфект ад гэтага падаходнага збору з камандорных маёнткаў у структуры губернскіх даходных паступленняў абумовіў назапашванне значнай сумы нядоімкі, пагашэнне якой з пануючага прывілеяванага саслоўя не было прыярытэтнай задачай урада, у параўнанні з ліквідацыяй падатковых запазычанасцей сялян і мяшчан.

## Бібліяграфічны спіс


1. Высочайше утверждённые правила 21.07.1799 г. для учреждения родовых командорств или jus patronatus в России // Полное собрание законов Российской империи (далей ПСЗ). Собр. 1-е. – СПб. : Тип. 2-го Отд-ния Собств. Е.И.В. канцелярии, 1830. – Т. 25. – № 19044. – С. 733–734.
2. Конвенция от 4(15).01.1797 г., заключённая с державным орденом Мальтийским и его преимуществом гроссмейстером об установлении сего ордена в России // ПСЗ-1. – Т. 24. – № 17708. – С. 261–268.
3. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 333. Воп. 1. Спр. 698.
4. НГАБ. – Ф. 694. Воп. 4. Спр. 1548.
5. НГАБ. – Ф. 3215. Воп. 1. Спр. 33.
6. НГАБ. – Ф. 3219. Воп. 1. Спр. 1370.
7. О принятии государём императором Александром I на себя звания протектора державного ордена св. Иоанна Иерусалимского: манифест 16.03.1801 г. // ПСЗ-1. – Т. 26. – № 19794. – С. 591–592.
8. О распорядке сумм ордена св. Иоанна Иерусалимского: именной указ 26.02.1810 г., данный генерал-фельдмаршалу графу Салтыкову // ПСЗ-1. – Т. 31. – № 24134. – С. 74.
9. О расходах по ордену св. Иоанна Иерусалимского: именной указ 13.11.1798 г., данный поручику великого магистра ордена св. Иоанна Иерусалимского графу Литте // ПСЗ-1. – Т. 25. – № 18748. – С. 445.
10. О родовых имениях фамильных командорств ордена св. Иоанна Иерусалимского: сенатский указ 20.11.1811 г. // ПСЗ-1. – Т. 31. – № 24882. – С. 908–909.
11. О составлении 10 командорств: именой указ 13.11.1798 г., данный поручику великого магистра ордена Св. Иоанна Иерусиламского графу Литте // ПСЗ-1. – Т. 25. – № 18751. – С. 446.
12. О составлении ордена Святого Иоанна Иерусалимского из 2 великих приорств: российско-католического и российского и о праве и старшинстве принятых в сей орден особ: манифест 28.12.1798 г. // ПСЗ-1. – Т. 25. – № 18799. – С. 502.
13. О установлении в пользу российского дворянства ордена Св. Иоанна Иерсалимского: манифест 29.11.1798 г. // ПСЗ-1. – Т. 25. – № 18766. – С. 455–458.
14. Об отпуске ежегодно 216 000 рублей на содержание командорств: именной указ 13.11.1798 г., данный государственному казначею // ПСЗ-1. – Т. 25. – № 18750. – С. 445.

15. Российский государственный исторический архив (РГИА). – Ф. 565. Оп.13. Д. 2708.
16. РГИА. – Ф. 565. Оп. 13. Д. 2763.
17. Свод законов Российской империи издания 1857 г. – СПб. : Тип. 2-го отделения собственной е.и.в. канцелярии, 1857. – Т. 5 : Свод уставов о податях.
18. *Стегний, П. В.* В тени восьмиконечного креста. Мальтийский орден и его связи с Россией / П. В. Стегний. – М. : Международные отношения, 2013. – 350 с.

УДК 94 : 379.81 "18/19" (476)

# ВЫЯЗНЫ МЕДЫЦЫНСКІ ТУРЫЗМ У БЕЛАРУСКІХ ГУБЕРНЯХ У СЯРЭДЗІНЕ XIX – ПАЧАТКУ XX ст.

**А. Л. Зянько**

*Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі, вул. Крапотніна, 55, 220002, г. Мінск, Беларусь, aksana.zenko@yandex.ru*

У артыкуле разглядаюцца пытанні развіцця медыцынскага турызму ў краіны Заходняй Еўропы з беларускіх губерняў у сярэдзіне XIX – пачатку XX ст.

***Ключавыя словы***: медыцынскі турызм; курорт; санаторый; лячэнне; аздараўленне.

# ВЫХОДНОЙ МЕДИЦИНСКИЙ ТУРИЗМ В БЕЛОРУССКОЙ ПРОВИНЦИИ В СЕРЕДИНЕ XIX – НАЧАЛЕ XX в.

**А. Л. Зенько**

*Национальный исторический архив Беларуси, ул. Кропоткина, 55, 220002, г. Минск, Беларусь, aksana.zenko@yandex.ru*

В статье рассматриваются вопросы развития медицинского туризма в страны Западной Европы из белорусских губерний в середине XIX – начале XX в.

***Ключевые слова***: медицинский туризм; курорт; санаторий; лечение; оздоровление.

# OUTGOING MEDICAL TOURISM IN THE BELARUSIAN PROVINCES IN THE MID-XIX – EARLY XX CENTURY

**A. Zenko**

*National Historical Archive of Belarus, Kropotkin str. 55, Minsk, Belarus aksana.zenko@yandex.ru*

The article deals with the development of medical tourism to the countries of Western Europe from the Belarusian provinces in the middle of the XIX – early XX century.

***Keywords:*** medical tourism; resort; sanatorium; treatment; recovery.